# ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ МУЗЕЯЎ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНАГА ПРОФІЛЮ

***В. Ю. Кацічава,***
*малодшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага гістарычна-археалагічнага музея, магістрант кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Узнікненне першых установаў музейнага тыпу (кунсткамеры, кабінеты, галерэі) адносіцца да эпохі Адраджэння (XV– XVI стст.). Музей жа ў форме сацыякультурнага інстытута з'яўляецца толькі ў перыяд Новага часу. Аднак гэтым значным падзеям папярэднічаў працяглы працэс калекцыяніравання прадметаў гісторыі і культуры, які мае свае вытокі ў антычнасці. З антычнай культурай звязана і слова *музей* (грэч. *museion* – храм муз) [9, с. 11], якое з таго часу зведала істотную трансфармацыю, стала асацыіравацца не толькі з сакральнай прасторай, але і з канкрэтным будынкам, месцам для займання навукай, літаратурай і творчых зносін.

Сярод матывацый стварэння першасных перадмузейных збораў даследчыкі пералічваюць наступныя: эканамічнага значэння, сацыяльнага прэстыжу, магічную, выражэння групавой прыналежнасці, стымуляцыі дапытлівасці і даследавання, эмацыянальнага перажывання. Даследчык музейнай справы В. П. Грыцкевіч дапоўніў гэтую сістэматызацыю, дадаўшы матывацыі збіральніцтва як доказу роднасці з легендарнымі продкамі, вылучыўшы асобным пунктам матывацыю збіральніцтва патрыятычнага характару [4, с. 80].

Калі гаварыць пра ўзнікненне музеяў, то трэба адзначыць, што асновай ваенна-гістарычных музеяў з'яўляліся калекцыі ваеннага характару, а таксама трафеі, здабытыя падчас бітваў і змаганняў. Прычым трэба мець на ўвазе, што ваенныя трафеі ў складзе антычных і сярэдневяковых калекцый былі прадстаўлены не толькі зброяй, амуніцыяй, узбраеннем, але і мастацкімі вырабамі, рэліквіямі, прадметамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Перш за ўсё чалавек ствараў калекцыі сакральнага характару ў пошуках сродкаў зносін з сілай, якая кіруе светам, спрабуючы такім чынам выйсці за межы свайго біялагічнага існавання [7, с. 109]. Аднак у збіранні ваенных калекцый праслежваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемазалежныя і звязаныя паміж сабой матывы эмацыянальнага перажывання, імкненне пацвердзіць і прадэманстраваць роднасць з легендарнымі продкамі. Таксама збор ваенных калекцый і трафеяў насіў, безумоўна, і патрыятычны характар.

Гэтыя тры групы матывацый з’яўляліся асноўнымі і вызначальнымі ў фарміраванні ваенных калекцый, значная частка якіх стала асновай для стварэння шматлікіх музеяў свету, у тым ліку і ваенна-гістарычных.

Упершыню наяўнасць прадметаў зброі, узбраення, трафеяў ваенных падзей назіраецца ў складзе старажытнагрэчаскіх калекцый, і асабліва ў грамадскіх і прыватных зборах Старажытнага Рыма.

Так, самай знакамітай сярод галерэй-порцікаў Афін лічылася Стоя Пойкіле. Яна была ўзведзена ў 457 г. да н.э., а сваю назву ў дакладным перакладзе «пярэстая», «размаляваная» атрымала дзякуючы вялікім карцінам, якія ўпрыгожвалі яе сцяну. Тут жа захоўваліся трафеі, якія нагадвалі афінянам аб ваенных перамогах: медныя шчыты знатных спартанцаў, узятых у палон на востраве Сфактэрыя ў 425 г. да н.э. [10, с. 20].

Ваенная экспансія Рыма спарадзіла збіранне не толькі звязаных з ваеннымі падзеямі прадметаў, але і практыку стварэння галерэй уласных герояў. З часам гэта прывяло да вялікай колькасці фігур імператараў і палкаводцаў на вуліцах горада. Усе вуліцы і плошчы яшчэ ў IV ст. былі застаўлены бронзавымі і мармуровымі статуямі [9, с. 19].

Як і ў старажытныя часы, у эпоху Сярэднявечча ў грамадскіх месцах змяшчаліся трафеі і мемарыяльныя прадметы. Так, жыхары італьянскага горада Пізы (Таскана) умуроўвалі ў фасады храмаў трафеі перамог над маўрытанскімі (арабскімі) уладарамі. У саборах іспанскіх гарадоў захоўваліся: у Таледа – партугальскі сцяг, захоплены ў бітве пры Тора (1476), у Бургасе – куфар касцільскага героя Сіда [3, с. 82]. Зброя, вайсковы рыштунак, узбраенне назапашваліся ў палацах і храмах Усходу. Шырока вядома пахаванне імператара Цынь Шыхуандзі ў Лінтуне (Кітай, III ст. да н.э.), якое цяпер музеефікавана [7, с. 109].

Эпоха Адраджэння дала пачатак многім музеям Заходняй Еўропы. Вялікая колькасць музейных збораў пачыналася як сховішчы зброі, прадметаў ваеннага начыння, арсеналы. Першым еўрапейскім ваенна-гістарычным музеем лічыцца Пантэон Славы [5, с. 17] , які быў створаны ў замку Амбрас (Аўстрыя)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўніком дынастыі Габсбургаў эрцгерцагам Фердынандам II (1565) [7, с. 114]. У кунсткамеры ў храналагічным парадку размяшчаліся прадметы ўзбраення. Інвентар гэтай калекцыі 1583 г. утрымоўвае звесткі аб 126 партрэтах герояў. Акрамя таго, у Фердынанда быў збор партрэтаў выбітных асоб Еўропы і кабінет рэдкасцей. Па дадзеных некаторых даследчыкаў, кунсткамера ў Амбрасе была музеем, які быў створаны для публічнага агляду [8, с. 299].

Збіранне памятнай зброі ў Расіі пачалося яшчэ пры двары кіеўскіх князёў. У першай палове XVI ст. з’явілася адно з найстарэйшых у Еўропе сховішчаў зброі – Збройная палата. У 1560 г. у Маскве была арганізавана першая ў Расіі выстава трафейнага ўзбраення [1]. Аналагічным Збройнай палаце быў збор у рэзідэнцыі польскіх манархаў у замку на Вавелі ў Кракаве. Аснову скарбніцы складалі трафеі, пераважна харугвы, здабытыя ў баях з ворагамі. Гэтыя і многія іншыя прадметы былі не толькі сімвалам палітычнай і эканамічнай магутнасці, яны інтэгравалі нацыянальную свядомасць [3, с. 74].

У эпоху Асветы гістарычныя калекцыі ваеннага характару развіваліся не так актыўна, як мастацкія зборы ці прыродазнаўчыя. Аднак такія зборы былі, але яны, як і раней, мелі характар цэнтралізаванага сховішча, закрытага для публікі. Так, узоры і гісторыю айчыннай зброі дэманстравала заснаваная ў 1775 г. Зала векапомных прадметаў Галоўнага артылерыйскага ўпраўлення (Цэйхгауза), 1711–1712. У 1868 г. Цэйхгауз быўператвораны ў Артылерыйскі ваенна-гістарычны музей.

На фоне ўздыму нацыянальнай самасвядомасці пасля вайны 1812 г. створаны ваенна-гістарычныя музеі ў Расіі: Ваенна-гістарычны музей пры Галоўным ваенна-інжынерным вучылішчы (1819), Ваенная галерэя Зімовага палаца (1826), Арсенал у Царскім Сяле (заснаваны Мікалаем I у 1832 г. на аснове асабістых калекцый; з 1852 г. даступны для агляду). У Еўропе: Ваенна-марскі музей (1827) у Парыжы; Каралеўская зброевая палата (Турын, 1837); у Даніі – Каралеўскі музей зброі (Капенгаген, 1838); у Турцыі – Ваенны музей у Стамбуле (1877); Ваенны музей Югаслаўскага народнага войска (Белград, 1878); у Швецыі – Каралеўскі музей войска (Стакгольм, 1879); у Аўстрыі – Ваенна-гістарычны музей (Вена, 1891)[1].

Значнае развіццё атрымалі ваенна-гістарычныя музеі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Яны былі адкрыты для публікі. Заснаваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музей А. В. Суворава ў Пецярбургу (1898), Барадзінскі музей (1903). З'явіліся першыя музеі ў вайсковых часцях (палкавыя музеі). У Заходняй Еўропе адным з буйнейшых ваенна-гістарычных музеяў з'яўляецца створаны ў 1917 г. Імперскі ваенны музей у Лондане. Былі заснаваны таксама і Музей Войска Польскага (Варшава, 1920), Ваенны музей у Празе (1919), у Балгарыі – Цэнтральны музей Народнага войска (Сафія, 1916).

У гады Другой сусветнай вайны музеі многіх краін панеслі значныя страты, аднак з 1942 г. у СССР пачалі ствараецца новыя музеі, прысвечаныя падзеям вайны. Сярод іх мемарыяльны музей лётчыка М. Ф. Гастэлы ў Мураме, Музей абароны Ленінграда, Ваенна-медыцынскі музей і інш., «па гарачых слядах» камплекталіся каштоўныя калекцыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1944–1945 гг. у савецкай краіне было заснавана 11 ваенна-гістарычных музеяў [1].

Значна вырасла колькасць ваенна-гістарычных музеяў СССР у 1950–1960-я гг. Так, былі заснаваны Цэнтральны музей Узброеных сіл у Маскве, Музей Айчыннай вайны 1812 г. у Таруціна, Кулікова поле. У 1995 г. быў адкрыты адзін з найбуйнейшых ваенна-гістарычных музеяў Расіі – Цэнтральны музей Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары ў Маскве.

Працэс узнікнення ваенна-гістарычных музеяў у Беларусі пачынаўся з прыватных магнацкіх калекцый. У XVII–XVIII стст. у Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў быў закладзены Мікалаем Крыштафам Сіроткам спецыяльна абсталяваны арсенал. На думку некаторых навукоўцаў, гэта і была першая ў Беларусі збраёўня – своеасаблівы музей зброі [6, с. 16]. Выраблены беларускімі майстрамі рэчы вайсковага прызначэння былі ўнікальныя. У адпаведнасці з замкавым інвентаром 1765 г. у арсенале захоўвалася вялікая колькасць халоднай і агнястрэльнай зброі, а таксама вайсковы рыштунак, які меў вялікую мастацкую каштоўнасць. Акрамя таго, там знаходзіліся гарматы з арыгінальнымі назвамі («Папугай», «Гідра», «Цэрбер») і афарыстычнымі надпісамі на ствалах. Найбольшая, датаваная 1600 г., была адліта непасрэдна ў нясвіжскай людвісарні Г. Молзера, іншыя – выраблены майстрамі заходнееўрапейскіх краін. Спецыяльнае памяшканне ў замку было адведзена пад сховішча старажытнасцей («скарбец»), дзе знаходзіліся гетманскія булавы, маршальскія жэзлы, меч, падараваны Радзівілам папам Інакенціем XI, калекцыя пячатак, пярсцёнкаў і асабістыя рэчы магнатаў Сабескіх, Вішнявецкіх і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існаваў таксама «патаемны скарбец», пра які ведалі толькі гаспадары замка і іх даверaныя асобы.

Крыніцы папаўнення радзівілаўскіх калекцый былі разнастайныя: як вырабы мясцовых майстэрань і мануфактур, так і замежныя паступленні. Па сваім характары нясвіжскі збор быў закрыты. Права на агляд было толькі ў прадстаўнікоў феадальнай знаці Рэчы Паспалітай, а таксама высокіх і замежных гасцей [5, с. 17–18].

Нясвіжскія ўладальнікі свой «скарбец» музеем амаль ніколі не называлі. Аднак адбор прадметаў, іх апісанне, сістэмнае размяшчэнне ў экспазіцыйных залах, непаўторнасць саміх экспанатаў, гістарычная і мастацкая іх значнасць – усё гэта дае падставу лічыць калекцыю Радзівілаў сапраўдным музеем. Да XIX ст. нясвіжская рэзідэнцыя ў пэўнай меры заставалася недатыкальнай, а музейныя зборы – амаль некранутымі.

Падобным да нясвіжскага па складзе, характары і крыніцах папаўнення быў збор вядомага магнацкага роду Сапегаў. Заснавальнікам збору лічыцца буйнейшы дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай Леў Сапега (1557–1633). Акрамя велізарнай бібліятэкі, нумізматычнай калекцыі, узораў мінералаў, калекцыі пячатак і прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у двух асобных пакоях Ружанскага палаца змяшчалася зброя, якая налічвала звыш 150 адзінак зброі, выробленай у розных еўрапейскіх краінах і на Усходзе. У адпаведнасці з інвентаром Ружанскага палаца 1793 г., там перахоўвалася зброя і рыштунак гетманаў Льва, Паўла і Казіміра, палаш падканцлера літоўскага Леона Казіміра, шпага канцлера Аляксандра ў каралавай аправе, аўгустоўка Францішка Сапегі з касцюшкаўскіх часоў, шатры, захопленыя пад Венай [5, с. 21].

Нягледзячы на амаль поўную сацыяльную ізаляванасць згаданых калекцый, на іх універсальны характар, гэтыя факты ніякім чынам не зніжаюць гісторыка-культурную і мастацкую каштоўнасць сапежанскага і радзівілаўскага збораў, іх вялікі ўклад у развіццё музейнай справы Беларусі і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Зборы гістарычнага профілю ў эпоху Асветы не атрымалі самастойнага значэння. Існуюць адрывістыя звесткі аб наяўнасці невялікіх гістарычных аддзелаў у музеях і прыватных зборах Беларусі другой паловы XVIII ст. Так, у адным з памяшканняў Полацкай езуіцкай калегіі ў шафах захоўваўся нумізматычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кабінет, а таксама «калекцыя розных рэдкасцяў», у склад якой уваходзіла зброя.

У XVIII–XIX стст. з'яўляюцца першыя ўстановы музейнага тыпу. Канец XIX ст. – адкрываецца першы агульнадаступны музей у Вільні (1856). Асноўныя калекцыі Віленскага музея старажытнасцей адлюстроўвалі матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў. У канцы XIX – пачатку XX ст. арганізуецца некалькі царкоўна-археалагічных музеяў. (Віцебскі царкоўна-археалагічны музей 1893 г., Магілёўскі царкоўна-археалагічны музей 1898 г.) І толькі адносна пачатку XX ст. маюцца ўскосныя звесткі пра існаванне ўласна ваенна-гістарычных музеяў у Беларусі. Так, у 1901 г. ваенным ведамствам быў адкрыты Ваенны музей у Вільні. Наведванне гэтага музея было абмежавана вайскоўцамі [5, с. 106]. У 1913 г. у горадзе Гродна адчыніў свае дзверы музей стралецкай справы, прыналежны да ваеннага ведамства. Даступнасць да агляду публікай была абмежавана вайскоўцамі.

Аднак ёсць каштоўныя звесткі і аб тым, што ў Беларусі ў пачатку XX ст. было распрацавана даволі шмат разнастайных праектаў па арганізацыі гістарычных і краязнаўчых музеяў. Гэтыя праекты па шэрагу прычын не ажыццявіліся. Аднак для вывучэння вытокаў музейнай справы ў Беларусі падобныя факты маюць выключную значнасць. Так, у 1914 г. існаваў праект адкрыцця музея, прысвечанага Першай сусветнай вайне. У хуткім часе пасля яе пачатку цыркуляр менскага губернатара пра стварэнне такога адмысловага музея атрымалі ўсе павятовыя спраўнікі і паліцмайстары. Адкрыць «музей Вялікай Айчыннай вайны» – менавіта так ён называецца ў крыніцы – планавалася пры лекарскім аддзеле Менскай губернскай управы.

Асноўнымі экспанатамі планаванай установы павінны былі стаць прадметы зброі і амуніцыі, снарады ці асколкі, друкаваныя выданні (брашуры, газеты, часопісы, карціны, геаграфічныя карты), лісты вайскоўцаў з фронту. Паліцмайстарам даручалася «аказваць магчымае садзейнічанне ў справе збору добраахвотных ахвяраванняў» [2, с. 43].

Другая сусветная вайна прынесла непамерныя страты музейнай справе ў Беларусі. Шматлікія гісторыка-культурныя каштоўнасці былі знішчаны. Большасць музеяў Беларусі была разрабавана. Аднак што датычыцца музеяў ваенна-гістарычнага профілю, адзіным такім музеем у Беларусі, які пачаў камплектаванне фондаў у гады ваеннага ліхалецця, з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пасляваенны перыяд пачалася праца па зборы і сістэматызацыі захаваных і вернутых з эвакуацыі музейных каштоўнасцей, аднаўленні музеяў. Пасля сканчэння вайны колькасць ваенна-гістарычных музеяў пачала ўзрастаць. На сёння ў Рэспубліцы Беларусь маецца 11 музеяў ваенна-гістарычнага профілю ва ўсіх раёнах і абласцях краіны.

Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што развіццё музеяў ваенна-гістарычнага профілю прайшло даволі доўгі і працяглы шлях ад протамузейных храмавых калекцый у Старажытнай Грэцыі і Рыме да фарміравання паўнавартасных музейных збораў. Першыя ваенныя калекцыі насілі сакральны характар, гэта былі ватыўныя дары і паднашэнні. У той жа час на сакральны сэнс рэчы, што абумоўлівалася яе поліфункцыянальнасцю і шматзначнасцю, накладаўся і іншы каштоўнасны сэнс – патрыятычны. Менавіта патрыятычная матывацыя была галоўнай і вызначальнай у стварэнні ваенна-гістарычных музеяў свету і Беларусі. Шырокае распаўсюджанне гэты працэс набыў пасля Французскай буржуазнай рэвалюцыі, а таксама пасля Першай і Другой сусветных войнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


1. *Востоков, Е. И.* Военно-исторические музеи / Е. И. Востоков // Российская музейная экциклопедия [Электронный ресурс] – URL: http://www.museum.ru/rme/sci_milit.asp.

2. *Грабянчук, І.* Музейныя праекты ў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / І. Грабянчук // Спадчына. – 2003. – № 3. – С. 39–45.

3. *Грицкевич, В. П.* История музеев мира : учеб. пособие / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Минск: БГУ, 2003. – 282 с.

4. *Грицкевич, В. П.* История музейного дела до конца XVIII века / В. П. Грицкевич ; М-во культуры и массовых коммуникаций Рос. Федерации, С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : СПбГУКИ, 2004. – 406 с.

5. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2001. – 109 с.

6. *Каханоўскі, Г.* Старажытныя музеі / Г. Каханоўскі // Спадчына. – 1989. – № 2. – С. 16.

7. Основы музееведения : учеб. пособие / Т. В. Абанкина [и др.]. – М. : Едиториал УССР, 2005. – 504 с.

8. *Семеновкер, Б. А.* Эволюция информационной деятельности : в 2 ч. / Б. А. Семеновкер ; Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2009. – Ч. 2 : Архивы. Библиотеки. Музеи. – 2011. – 333 с.

9. *Сотникова, С. И.* Музеология / С. И. Сотникова. – 2-е изд. – М. : Дрофа, 2010. – 190 с.

10. *Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учебник / Т. Ю. Юренева. – 4-е изд., испр. и доп. – М. : Акад. проект : Альма Матер, 2007. – 558 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ